# Страхаванне

Страхаванне перавозак – гэта гарантыя таго, што непрадбачаныя абставіны не прывядуць да сур’ёзных матэрыяльных страт для ўладальніка.
Перавозкі грузаў незалежна ад статусу і вопыту работы транспартнай кампаніі, звязаны з пэўнай рызыкай. Страхаванне дае магчымасць мінімізаваць урон і пакрыць страты ў выпадку ўзнікнення любых непрадбачаных сітуацый.
У працэсе транспарціроўкі грузу могуць узнікнуць форс-мажорныя абставіны, якія вядуць да непажаданых наступстваў:

- страта грузу,
- псаванне часткі або ўсяго грузу,
- недахоп грузу,
- затрымка дастаўкі грузу, зрыў тэрмінаў.

ТЛЦ аказвае паслугі па аптымальным выбары віду і тыпу страхавання.
У залежнасці ад спецыфікі грузу і яго транспарціроўкі магчыма некалькі варыянтаў страхавання з выбарам аптымальнага пакета паслуг рознымі страхавымі кампаніямі:

- Разавае (разлічанае на разавую транспарціроўку канкрэтнага грузу).
- Генеральны дагавор (страхавы дагавор, заключаны на пэўны перыяд часу, напрыклад, на год у выпадках, калі пастаўкі пастаянныя)